Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 12 (28122) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хлеб — усяму галава**

СТАР. 2



**На выхадных — моцныя маразы**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел ФІЛІПАЎ, начальнік упраўлення эканомікі, фінансаў і цэн Міністэрства гандлю:**

*«У цяперашняй сітуацыі цэнавых успleскаў не прадбачыцца. Калі будзе моцна павышана цана, то пакупнік проста пойдзе ў суседнюю краму і купіць тавар па цане, якая яго задаволіць. Сітуацыю стабілізуе канкурэнцыя — на спажывецкім рынку краіны прадстаўлены шырокі спектр вытворцаў і вялікі асартымент тавараў. У нас дастатковае насычэнне рынку, створана добрае канкурэнтнае асяроддзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.01.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 21564,00 ▲ |
| Еўра | 23779,00 ▲ |
| Рас. руб. | 260,24 ▲ |
| Укр. грыўня | 884,68 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МАЙСТРЫ БОЧКІ ЎПРЫГОЖВАЮЦЬ



**Палеская вёска Багданаўка, што на Лунінеччыне, да вайны і пасля яе славілася майстрамі бондарскіх спраў. Старэйшыя багданаўскія жыхары прыгадваюць, што кожны трэці мужчына ў вёсцы займаўся гэтым старажытным рамяством. Бондарства дапамагала людзям выжываць, адбудоўваць спаленую вёску. Бочкі, цэбры і кублы, кадушкі, барылы і балеі, маслабойкі і іншы бандарны «посуд» разыходзіўся па навакольных вёсках, прадаваўся на кірмашах у Пінску і Лунінцы. Васіль КАВАЛЕВІЧ *(на фота)* з тых пасляваенных майстроў, якія і сёння працягваюць сямейную справу — выбіраць адмысловае дрэва, габляваць, падганяць клёпкі пад абручы. Акрамя яго і малодшага брата Міхаіла, у Багданаўцы ўжо не засталося сапраўдных майстроў.**

**— Мяне ў маленстве навучыў гэтаму рамяству бацька. Здаецца, што няма ў свеце лепшай справы, чым бондарства, — кажа Васіль Іванавіч. — Па-ранейшаму людзі цэняць традыцыйныя вырабы з дрэва, раз-пораз звяртаюцца да мяне з просьбамі і замовамі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

***Лунінецкі раён.***

■ Круглы стол

## РАВЕСНІЦА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Дзяржаўнасць — несумненны здабытак Беларусі. Яна не з'яўляецца і не даецца сама сабой. Нацыя і народ да яе вырастаюць. Аднак і пасля свайго з'яўлення дзяржаўнасць не становіцца нейкай статычнай, гарантаванай данасцю. Яна развіваецца, сталее, перажывае крызісы, пераадольвае пагрозы, адказвае на рызыкі. І для таго, каб яна мацнела, набірала вагу і забяспечвала свайму народу бяспеку і росквіт, патрэбны спецыяльна навучаныя людзі — кіраўнікі. Дзяржаўныя службоўцы і дзяржаўныя дзеячы, якія валодаюць найвышэйшымі прафесійнымі якасцямі. Менавіта такіх людзей рыхтуе ў нашай краіне ўнікальная навучальная ўстанова — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. 29 студзеня яна будзе афіцыйна адзначаць свае 25 гадоў, але святочныя мерапрыемствы ў Акадэміі ўжо ідуць. У сценах газеты «Звязда» з нагоды такой прыгожай даты прайшоў медыясемінар, дзе выкладчыкі і кіраўнікі акадэміі расказвалі пра яе асаблівасці і задачы сённяшняга дня.**

СТАР. 4




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Сталічнае жыллё

## ПАДЗЕННЕ ЦЭН ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА ЛЕТА

### Аналітыкі чакаюць, што рост камунальных плацяжоў павялічыць прапанову вялікіх кватэр на рынку жылля

**Першы месяц года падкінуў беларусам не толькі сінаптычныя сюрпрызы ў выглядзе двух моцных цыклонаў. Ужо на старце студзеня нам паведамілі аб росце камунальных плацяжоў, а жыхарам мегаполіса агучылі і новыя цэннікі на ваду, за карыстанне ліфтам і іншае. Не застаўся без увагі і кошт замежнай валюты. Разам са спецыялістамі ў сферы нерухомасці мы паспрабавалі разабрацца, як прыведзеныя фактары паўплываюць на далейшую дынаміку жыллёвых коштаў.**

### Летась — патанненне з «пераборам»

Яшчэ напачатку 2015-га наш пастаянны эксперт жыллёвай сферы — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай **ПРАСТАЛУПАЎ** даваў самы смелы прагноз аб патанненні за сезон на 15%. Гэты прагноз быў перавыканаНы ўжо восенню, калі нерухомасць згубіла 18%, а па выніках года рынак атрымаў мінус 24%. Адразу заўважу, што дадзены трэнд на зніжэнне коштаў падлічваецца спецыялістамі ў доларавым эквіваленце. А ў рублях наша нерухомасць, магчыма, нават падаражэла...

### Бюджэтная аднапакаёўка — ад 35 тысяч долараў

Сярэдні кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр у Мінску складае каля 1380 долараў. Гэтая лічба атрымліваецца пасля аналізу каталогу прапаноў.

СТАР. 3

# ГЭТА І ЁСЦЬ ПАРТНЁРСТВА

## Прэзідэнт патрабуе падтрымліваць прадпрыемствы прыватнай формы ўласнасці

**Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў учора падчас наведвання вытворча-гандлёвага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінатор-Сэрвіс», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзяржава, урад, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў «не павінны бачыць у прыватніках нейкіх ворагаў, сапернікаў, а павінны ставіцца да іх, як і да дзяржаўных прадпрыемстваў». «Вы гэта называеце прыватна-дзяржаўнае партнёрства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён выказаў меркаванне, што прыватнікам трэба развівацца зыходзячы з патрабаванняў часу і на карысць людзям. «Калі з чагосьці малога пачыналі, то развівайцеся далей», — пераканаы Прэзідэнт. Ён бачыць добрыя перспектывы для істотнага развіцця прыватных прадпрыемстваў.

Кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў дзейнасць «Мінатор-Сэрвіса»: «Перспектыва вашага і іншых прыватных прадпрыемстваў — каб яны выраслі ў магутныя структуры абароннага сектара, якія будуць працаваць не толькі на ўнутранае спажыванне, але і на знешняе». Ён звярнуў увагу на той факт, што істотная частка бюджэту фарміруецца за кошт прыватных прадпрыемстваў.

Аляксандру Лукашэнку расказалі аб тым, як ствараласяПУП «Мінатор-Сэрвіс». Яно было ўтворана на базе занядбанага прадпрыемства. За ўласныя грошы была створана новая вытворчасць, якая стала выпускаць прадукцыю. Такім чынам, з'явіліся новыя рабочыя месцы, выплачваюцца падаткі, вырабляецца прадукцыя. Пры гэтым на згаданым прадпрыемстве людзі атрымліваюць добрую зарплату — амаль $700. Як падкрэсліў Прэзідэнт, менавіта такой — спакойнай, эфектыўнай — і павінна быць прыватызацыя. Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з тэхналагічнымі працэсамі вытворчасці. Яму расказалі аб перспектыўных праектах прадпрыемства.

Акрамя таго, Прэзідэнта праінфармавалі аб рабоце Дзяржкамваенпрама па ўключэнні ў абаронны сектар эканомікі прадпрыемстваў прыватных формаў уласнасці і павышэнні эфектыўнасці іх дзейнасці.

■ Хлеб надзённы

# ТОЙ САМЫ СМАК...

**«Хлеб усяму галава» — так казалі калісьці нашы продкі. Зрэшты, гэты выраз актуальны і цяпер. Хлеб — сімвал шчасця, дабрабыту, стваральнай працы, міралюбства. Невыпадкова на гербе нашай краіны хлебныя каласы. Здаўна бацькі сустракалі на парозе маладых хлебам-соллю, зернем асыпалі жаніха і нявесту, калі тыя ішлі да шлюбу. У Міхаіла Аляксеева ёсць аповесць «Хлеб — имя существительное». (Менавіта так казаў адзін з герояў твора.) Усе астатнія прадукты — дадатак да асноўнага, хлеба. Пра яго можна казаць бясконца, як пра само жыццё. Хлеб гэта і ёсць жыццё. І клопаты аб хлебе надзённым былі і будуць галоўнымі для людзей. А значыць, жывуць і будуць жыць прадпрыемствы, што пякуць хлеб.**



НАД цэнтральным уваходам у будынак Вілейскага хлебазавода — філіяла адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўхлебпрам» — размешчаны лагатып «Водар хлеба». Менавіта пад такім брэндам тут выпускаецца прадукцыя. А пах свежай выпечкі адчуваецца яшчэ на падыходзе, за некалькі соцень метраў.

**Сёння на прадпрыемстве працуе 242 чалавекі. А трапіць сюды шмат ахвотных: сярэдняя зарплата — 6-7 млн рублёў.**

На парозе сустракае **дырэктар прадпрыемства Анатоль СЯРГЕЙ** — у калектыве заўсёды рады гасцям: тут ёсць што паказаць і пра што расказаць.

40% сваёй прадукцыі хлебазавод пастаўляе ў горад Вілейку і раён, астатнюю рэалізуе за межамі рэгіёна — у Смаргоні, Астраўцы, Ашмянах, Паставах, Мядзеле, Глыбокім, Мёрах, Бягомлі і Мінскім раёне. Сёлета на 30% павялічылі продаж у Мінску. Па пятніцах дастаўляюць хлеб у Гродна. Ведаюць вырабы завода і ў Санкт-Пецярбургу — рэч у тым, што адно з прадпрыемстваў раёна адпраўляе туды каўбасы, а хлебазавод дагружае машыну сваёй прадукцыяй. Транспартныя расходы ды і іншыя выдаткі дзеляць па-роўну. Выгадна і тым, і тым.

Калі вілейскі хлеб прысутнічае на рынку іншых рэгіёнаў краіны, мабыць, і ў вілейскія крамы завозяць хлебабулачныя і кандытарскія вырабы профільныя прадпрыемствы з іншых абласцей Беларусі? Аказалася, у Вілейцы гандлёвыя кропкі прадаюць прадукцыю пяці хлебазаводаў, у тым ліку з Валожына, Мінска, Смаргоні, Маладзечна. Канкурэнцыя даволі высокая. Што гэта дае?

З аднаго боку, у спажыўцоў ёсць выбар. А з другога — ідзе своеасаблівае спаборніцтва за кожнага з іх, а гэта стымулюе вытворчасць і адпаведную якасць прадукцыі.

— Мы імкнёмся «ўзяць» пакупніка якасцю і цаной. Вывучаем попыт, смакавыя схільнасці розных катэгорый насельніцтва. Напрыклад, у крамы, дзе маюцца вырабы розных хлебазаводаў, завозім менавіта тыя, што найбольш падабаюцца людзям і ахвотна імі раскупляюцца. У гарадах, дзе ёсць хлебная вытворчасць райспажыўсаюзаў, імкнёмся зніжаць цану на сваю прадукцыю, — канстатуе суразмоўца.

МНОГІЯ памятаюць, што ў савецкія часы выбар хлеба быў абмежаваны — не налічвалася і дзясятка гатункаў (падавалася наогул не было). Затое спажывалі хлеба шмат, у прыватнасці, у Вілейцы — больш як два кілаграмы на чалавека ўдзень, а на заводзе выраблялі больш як 30 тон хлеба штодня, ды яшчэ столькі выпускаў райспажыўсаюз. Цяпер філіял выпякае каля 17 тон хлебабулачных вырабаў штодня, але асартымент іх непараўнальна большы.

— Гэта 40 найменняў хлебабулачных і 60 найменняў кандытарскіх вырабаў, — кажа **начальнік вытворчай лабараторыі Таццяна БАЛАШ.** — Працуем з улікам розных катэгорый насельніцтва і іх густаў. Апошнім часам распрацавалі рэцэптуру двух гатункаў хлеба: аржана-пшанічны і пшанічны з выкарыстаннем шатраванай мукі. Гэтая мука карысная тым, што ўтрымлівае больш мінеральных рэчываў і вітамінаў. Прадукт з яе раім тым, хто хоча правільна харчавацца. Акрамя таго, мука грубага памолу таннейшая, чым пшанічная. Таму і хлеб з яе менш каштуе. Выпускаем хлеб і для хворых дыябетам, і для тых, хто імкнецца падтрымліваць добрую фізічную форму, клапоціцца аб сваім страўніку. Апошнім часам вялікім попытам карыстаецца бездражджавы хлеб.

Таццяна Канстанцінаўна — сапраўдны прафесіянал, з тых, хто ў пастаянным творчым пошуку. Яе знаходка — торт парцыённы: частка з вяршкоў, частка — пясочная. Навінка спадабалася аматарам салодкага, яна ідзе «на ўра» як у гандлёвай сетцы, так і па індывідуальных заказах. Мне расказалі, што ў некаторыя кандытарскія вырабы дабаўляюць экстракт бярозы. Гэты натуральны прыродны кампанент вучоныя выдзелілі з кары беластвольнай бярозы. Незвычайныя якасці бярозы вядомы здаўна, яе выкарыстоўвалі ў лячэнні. У спецыяльных ёмістасцях з бярозы захоўвалі рыбу, мёд, малако, масла: прадукты доўга не псаваліся...

СЁННЯ на прадпрыемстве працуе 242 чалавекі. А трапіць сюды шмат ахвотных: сярэдняя зарплата — 6-7 млн рублёў. Аснову калектыву складаюць людзі са стажам, вопытныя спецыялісты. Наталля Гіль 30 гадоў таму перайшла з вытворчасці безалкагольных напояў у хлебабулачны цэх, і сёння яна замешвае хлебнае цеста. Менавіта ад гэтага спецыяліста залежыць канчатковы вынік: трэба захаваць усе параметры, тэхналогію, каб хлеб атрымаўся смачны і якасны.

Дадам, што прадпрыемства не мяняла сваёй прапіскі з моманту заснавання — 1973 года. Але цэхі выглядаюць вельмі прывабна, бо тут надаюць вялікую ўвагу парадку, абнаўленню вытворчасці, новым тэхналогіям.

— Цяпер ідзе мадэрнізацыя склада бястарнага захавання мукі — часткова новае абсталяванне ўведзена ў дзеянне. Заканчыцца ўвесь працэс да канца года, — адзначыў галоўны **інжынер Дзмітрый ЛЯХ.** — Гэта дазволіць прадпрыемству сэканоміць электраэнергію і наладзіць дакладную дазіроўку мукі.

**«Выпускаем хлеб і для хворых дыябетам, і для тых, хто імкнецца падтрымліваць добрую фізічную форму, клапоціцца аб сваім страўніку. Апошнім часам вялікім попытам карыстаецца бездражджавы хлеб».**

ЛЕТАСЬ на хлебазаводзе актыўна займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі: заасфальтавалі, зрабілі бардзюры. Сёлета вясной работы прадоўжацца. Дадам, што ў мадэрнізацыю і рамонт прадпрыемства ўкладвае ўласныя сродкі, разумеючы важнасць гэтага кірунку.

Акрамя таго, калектыў дапамагае Вілейскаму дашкольнаму цэнтру развіцця дзіцяці. У прыватнасці, у спартыўную залу шэфы закупілі неабходнае абсталяванне і гульнявыя дарожкі. Дырэктар хлебазавода Анатоль Сяргей уважліва ставіцца да просьбаў адміністрацыі цэнтра, бо на здароўі дзяцей эканоміць нельга. Да таго ж, хто ведае, магчыма, хтосьці з іх у будучым захоча стаць хлебапёкам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ЧАС ДЛЯ ЗВАНКОЎ

Субота для многіх жыхароў краіны ўжо стала часам для вырашэння набалелых праблем. Менавіта ў гэты дзень свае пытанні можна задаць кіраўнікам мясцовых выканкамаў, а часам і атрымаць адказ анлайн.

***У гэтую суботу, 23 студзеня, з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:***

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).


Паритетбанк
www.paritetbank.by

К сведению акционеров Открытого акционерного общества «Паритетбанк», расположенного по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, ранее объявленное на 28 января 2016 года внеочередное Общее собрание акционеров в очной форме не состоится.

Справки по тел. (017) 288 63 31.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 г. № 5. УНП 100233809.


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Лужки, д. Грудок Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **25 февраля 2016 года, в 15.00,** аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1400 га, № 624883005601000161, д. Лужки (по гп. № 5) Лот № 2 — площадь 0,1478 га, № 624883002601000047, д. Грудок (по гп. № 2) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 200 000 000 рублей Лот № 2 — 200 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Лужки — нет д. Грудок — нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058, ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | **19 февраля 2016 года в 17.00** |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт), и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

# ГРУЗАВІКІ — ПАД АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛЕМ

**Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмацніла кантроль за захаваннем правіл спынення і стаянкі грузавых транспартных сродкаў.**

— Рыпаркаваныя не па правілах аўтамабілі ствараюць пагрозу бяспецы дарожнага руху і перашкоды камунальнай і снегаўборачнай тэхніцы, — гаворыць **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Асабліва негатыўна на дарожную абстаноўку ўплываюць вялікагрузныя транспартныя сродкі. У сувязі з гэтым Дзяржаўтаінспекцыя Мінска будзе штодня праводзіць рэйды і выяўляць грузавікі, рыпаркаваныя з парушэннем Правіл дарожнага руху. Згодна з імі, у жылой і пешаходнай зонах, на прылеглай тэрыторыі забараняецца стаянка грузавых аўтамабіляў, аўтобусаў, колавых трактароў і самаходных машын па-за спецыяльна адведзенымі месцамі, абазначанымі знакам «Месца стаянкі», калі гэта не звязана з выкананнем імі работ. За незахаванне нормаў паркоўкі Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжаны штраф у памеры пяці базавых велічынь. Пры паўторным падобным парушэнні цягам года сума штрафу складзе дзесяць базавых велічынь.



**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Надвор'е

# НАЦЯГВАЕМ ШАПКУ З ВУШКАМІ

## На выхадныя маразы будуць дасягаць месцамі мінус 27 градусаў

**Камфортнае зімовае надвор'е, якое цалкам адпавядае трэцяй дэкадзе студзеня, хутка зменіцца. У гэтыя выхадныя на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халоднае паветра і маразы ўзмоцняцца, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

А сёння ўдзень чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, пройдзе невялікі снег. Месцамі магчымы слабы туман. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе мінус 5—10 градусаў, па паўночным усходзе месцамі будзе на пару градусаў ніжэй.

Прагназуецца, што ў выхадныя дні надвор'е будзе вызначаць зона павышанага ціску і халодныя паветраныя масы, якія паступаюць з поўначы кантынента. У суботу і нядзелю ў асобных раёнах пройдзе невялікі снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 15—22 градусы, пры праясненнях — нават да 23—27 марозу, а ўдзень чакаецца мінус 8—13 градусаў, месцамі — мінус 14—17; толькі па паўднёвым захадзе будзе цяплей, калі ўначы прагназуецца мінус 9—14, а ўдзень — мінус 4—7 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е будуць вызначаць малаактыўныя атмасферныя франты, якія рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора. Амаль без ападкаў, аднак маразы будуць паступова слабець. У панядзелак месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 13—20 градусаў (па ўсходзе — да мінус 25), а ў паўднёва-заходніх раёнах — у асноўным 5—12 марозу. Удзень тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 па паўднёвым захадзе да 16 марозу па паўночным усходзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ПАДЗЕННЕ ЦЭН ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА ЛЕТА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Пры ацэнцы рэальных здзелак узнікаюць крыху іншыя паказчыкі. Напрыклад, сёння ў сталіцы існуюць кватэры невялікіх плошчаў, якія прапануюцца па цэнніку ў дыяпазоне ад 35 да 45 тысяч долараў. Дык вось, сярод іх цяпер сустракаюцца кватэры, дзе квадратны метр будзе каштаваць 1150—1200 долараў. А калі падобная кватэра знаходзіцца на крайніх паверхах старога пяціпавярховага дома, то гаспадар жылля згаджаецца і на дадатковую знiжку.

Разам з тым хапае цяпер на рынку і тых, хто спрабуе прадаць стандартнае жыллё па завышаных цэнах. Мне асабіста цяжка зразумець логіку прадаўца, які спрабуе прадаць аднапакаёвую кватэру плошчай каля 37 квадратных метраў за 75 тысяч долараў. У каталогу прапануецца дастатковая колькасць кватэр з плошчай да 50 «квадратаў», цэннік якіх вагаецца ў межах 55—60 тысяч долараў.

## Двухпакаёўка стартуе з 42 тысяч

Самая вялікая колькасць прапаноў гэтай зімой прыпадае на двухпакаёвыя кватэры. Даволі шмат тут невялікіх «хрушчовак», а таксама варыянтаў жылых памяшканняў з сумежнымі пакоямі. У падобных выпадках кошт квадратнага метра слабенькіх па якасці кватэр можа дасягаць 1050—1150 долараў. Увогуле сярэдні кошт «квадрата» двухпакаёвых кватэр сёння знаходзіцца ў межах 1300 долараў. Пераважная колькасць стандартных кватэр з невялікай жылой плошчай прапануецца кліентам за 52—62 тысячы долараў.

У сегменце трохпакаёвых кватэр нават сярэдні кошт прапанова квадратнага метра агульнай плошчы па ўсіх пазіцыях складае каля 1270 долараў. Пры рэальных здзелках па бюджэтных варыянтах такі «квадрат» можа зніжацца ў кошце да 1000 долараў. Напрыклад, трохпакаёвая кватэра агульнай плошчай 57 квадратных метраў у пяціпавярховым доме па вуліцы Каліноўскага прапануецца меняць за 57 тысяч долараў. Магчыма, што планіроўка падобнага жылля падыдзе далёка не ўсім (плошча кухні складае ўсяго 5,8 квадратнага метра), аднак сам факт такой прапановы сведчыць аб гатоўнасці прадаўцоў пераскочыць прынцыповую мяжу ў тысячу долараў. Самы масавы цэннік трохпакаёвых кватэр цяпер мае дыяпазон ад 70 да 85 тысяч долараў.

## У пошуках цэнавага дна

Увогуле, звычайна цэны на жыллё ў нас залежаць ад даходаў насельніцтва, танных крэдытаў і аб'ёмаў будаўніцтва жылля. Сёлета чацвёртым фактарам цэнавых ваганняў часткова можа стаць і новая «камуналка».

З павелічэннем даходаў сёлета будзе складана. Праблемы ў эканоміцы аўтаматычна зачыняюць перад людзьмі дзверы ў банк, дзе на агульных падставах выдаюць даступныя крэдыты. А льготнае крэдытаванне істотна скарацілася, бо на практыцы «доўгія» грошы на будаўніцтва цяпер выдаюць толькі шматдзетным сем'ям. З другога боку, сёлета будаўнічы комплекс абяцае дабудаваць раней пачатае жыллё, а прыватныя забудоўшчыкі будуць вымушаны распрадаваць ужо пабудаванае. Акрамя таго, хапае сёння ў сталіцы і зусім свежых аб'ектаў, дзе будаўніцтва толькі стартуе.

На думку **намесніка дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святланы КУДЗЕЛКІ**, кошты на жыллё ў першай палове года будуць памяншацца, аднак тэмпы гэтага працэсу стануць неаднолькавымі для розных сегментаў другаснага рынку. Спецыяліст упэўнена, што найбольш істотна кошты знізяцца па разрадзе старога жылля, дзе прагноз да лета — мінус 10—15%. Істотна гэты сезон падкарэктуе апетыты і гаспадароў дарагога жылля. Цэннікі такіх кватэр толькі да ліпеня могуць згубіць мінімум 20%. Аднак у сегменце стандартных кватэр з рамонтам, С. Кудзелка падстаў для нейкага сур'ёзнага патаннення не бачыць. На яе погляд, цэнавае дно па такіх кватэрах ужо блізка. Магчыма, што да лета цэннікі якаснага «стандарту» патаннеюць яшчэ на 5-6%.

Мікалай Прасталупаў паведаміў, што многае залежыць ад сітуацыі з новабудоўлямі. Цяпер кампанія «Мінск-Мір» пачынае прадаваць кватэры ў першым сваім будучым доме. Ужо вядомы кошты «квадратаў» для двухпакаёвых і трохпакаёвых кватэр. Цэннік у 15 млн рублёў (па стане на 20 студзеня) адпавядаў 750 доларам. Так, у эксплуатацыю дом будзе здадзены праз 2-3 гады. А за гэты час «квадрат» можа яшчэ патаннець. Гэта толькі першая ластаўка з боку камерцыйнага забудоўшчыка, які вырашыў так істотна знізіць кошты. А далей пачне працаваць механізм канкурэнцыі.

«Такім чынам, ужо ў другой палове лета на рынку новага будаўніцтва будзе шмат прапаноў, дзе кошт квадратнага метра складзе ад 850 да 900 долараў», — упэўнены наш эксперт. Цэнавае дно па навабудоўлях складзе ў межах 800 долараў за квадратны метр, лічыць ён.

## Чацвёрты фактар можа і не «стрэліць»

Новыя жыроўкі беларусы атрымаюць ужо ў лютым. Цікава, што мы там убачым? У радку «тэхнічнае абслугоўванне» квітанцыя папоўніцца адразу чатырма пунктамі. Цяпер на плечы насельніцтва ляглі затраты па ўборцы і асвятленні месцаў агульнага карыстання, а таксама тэхнічным абслугоўванні ліфта і выкарыстанай ім электраэнергіі. Памеры ўзносаў на абслугоўванне ліфта будуць залежаць ад колькасці зарэгістраваных у кватэры жыхароў, а вось на плату за асвятленне, тэхабслугоўванне і ўборку месцаў агульнага карыстання паўплывае плошча кватэры. Чым жыллё большае — тым і плаціць прыйдзецца больш.



Камунальнікі паведамляюць, што жыхары маюць магчымасць самастойна вырашыць пытанне ўборкі пад'ездаў: плаціць за работу супрацоўнікам ЖЭСа, наняць прыбіральшчыцу збоку або сваімі сіламі ўтрымліваць пад'езд у чысціні. Уборка двара будзе ажыццяўляцца за кошт мясцовага бюджэту. Дарэчы, у пералік гэтых работ уваходзіць і ўборка тэрыторый ад снегу.

Самыя балючыя для насельніцтва змены закранулі тарыфы на ваду. З першых дзён студзеня кошт вады, якую расходуюць мінчане, лічаць па-новаму: ільготны тарыф на водазабеспячэнне і каналізацыю павялічыўся з 2,5 тысячы рублёў да 8,9 тысячы рублёў за кубічны метр, практычна дасягнуўшы тарыфаў «па сабекошце», якія сёння лічаць па 9 тысяч рублёў за кубаметр. Акрамя таго, сёлета на 20% павялічыліся тарыфы на газ і электрычнасць у сувязі з рашэннем уключаць у кошт паслугі памер падатку на дабаўленую вартасць. Усё гэта на рынак жыллёвай нерухомасці паўплывае толькі ўскосна. Напрыклад, цяпер пенсіянерам, якія жывуць у вялікіх кватэрах, стане складаней аплачваць такія камунальныя тарыфы.

Аднак Святлана Кудзелка лічыць, што пакуль наўрад ці з-за высокай кватплаты людзі стануць масава пазбаўляцца ад кватэр ці з'язджаць на меншыя плошчы, бо налічэнні ў большай ступені ідуць на душу насельніцтва, а не на квадратныя метры жылля.

Але па аплаце камунальных паслуг ёсць яшчэ адзін істотны момант. У студзені амаль у два разы павялічыўся кошт ацяплення ў пустых кватэрах. А гэта ўжо сур'ёзна. У кватэрах, якія адразу былі падрыхтаваны для продажу, звычайна ніхто не зарэгістраваны. Маразы цяпер стаяць сур'ёзныя, а значыць і пры звычайных тарыфах ацяпленне будзе біць па кішэні. Таму пустое жыллё ўласнікам паўстане ў добрую капейку.

У гэтым выпадку гаспадары падобных пустых метраў будуць вымушаны выстаўляць сваё жыллё на рынак па рэальных коштах або па мінімальным цэнніку прапаноўваць сваё жыллё на рынак арэнды. А гэта... Тады ў любым выпадку бескватэрныя жыхары сталіцы толькі выйграюць.

## Прагноз на «паслязаўтра»

Мікалай Прасталупаў раскрыў увогуле самы смелы прагноз, які тычыцца не толькі другой паловы бягучага года. Наш эксперт лічыць, што гэтым летам на другасным рынку жылля прагназуецца толькі часовая стабілізацыя коштаў. Надалей жыллё будзе таннець ужо не такімі моцнымі тэмпамі. Больш таго, М. Прасталупаў лічыць, што зніжэнне коштаў у сферы жыллёвай нерухомасці будзе назірацца і ў пачатку 2017 года. Пабачым.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ПАДРОБЛЕНЫЯ ГРОШЫ ВЯЗУЦЬ З-ЗА МЯЖЫ

## ЛЕТАСЬ У КРАІНЕ ЗАФІКСАВАЛІ БОЛЬШ ЗА 900 ФАКТАЎ ФАЛЬШЫВАМАНЕЦТВА

**У Міністэрстве ўнутраных спраў лічаць, што рост колькасці падобных выпадкаў (у 2014 годзе іх было крыху больш за 790) звязаны з сітуацыяй на валютным рынку краіны. Пазалетась, у снежні, калі выбухнуў крызіс, многія жыхары краіны пачалі набываць грошы з рук. У выніку грашовыя фальшыўкі патрапілі ў легальнае абарачэнне.**

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС паведамілі, што прадметам правапарушэнняў найчасцей станавіліся долары ЗША (498 фактаў), еўра (104), расійскія (298) і беларускія рублі (38). Таксама атрымалася выявіць 6 выпадкаў збыту падробленых кітайскіх юаняў і 1 — украінскай грыўні. Супрацоўнікі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі вывелі з абарачэння 1763 падробленыя банкноты. 10 фальшываманетчыкаў за супрацьзаконную дзейнасць былі асуджаны.

Фальсіфікаты ў Беларусі амаль не вырабляюць. Яны паступаюць да нас пераважна з-за мяжы. Найбольшую колькасць падробак прывезлі з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы. Агулам — з 32 краін свету.

Варта дадаць, што некаторыя прадпрымальныя асобы спрабуюць абмяняць так званыя сувенірныя грошы. І падобныя спробы нярэдкія. Толькі летась зафіксавалі 241 падобны факт. Але трэба памятаць, што на вырабах, якія імітуюць амерыканскія долары, маецца тэкст «Не з'яўляецца плацежным сродкам», на расійскіх рублях напісана «Білет банка прыколаў», на еўра — «SOUVENIR PRODUCTION». Каб не было падвоху, Міністэрства ўнутраных спраў раіць рабіць усе валютныя аперацыі ў банках, не набываць валюту з рук і не ўдзельнічаць у сумнiўных здзелках.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

# РАВЕСНІЦА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

## Тры кіты альма-матар

**Андрэй ЦОБКАЛА, намеснік дырэктара Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь — дэкан факультэта падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт:**



— Дваццаціпяцігоддзе — гэта і ўзрост сталасці, і ўзрост маладосці. Гэта ўзрост не толькі акадэміі, але нашай краіны як суверэннай дзяржавы. Нашы выпускнікі займаюць дзяржаўныя пасты, пасады кіраўнікоў самых розных узроўняў, пачынаючы з сельскіх Саветаў і заканчваючы эшалонамі вышэйшай дзяржаўнай улады краіны. Так што я лічу, што гэта свята нашай маладой суверэннай дзяржавы, у якой мы цяпер жывём.

Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь складаецца з трох частак: Інстытут дзяржаўнай службы, Інстытут кіраўніцкіх кадраў і Навукова-даследчы інстытут тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання.

Задача падрыхтоўкі дастаткова кампетэнтных кіраўнікоў дзяржавы на ўсіх узроўнях вырашаецца выкладчыкамі Інстытута дзяржаўнай службы і Інстытута кіраўніцкіх кадраў. Усяго ў нас 17 кафедраў. І кожная — унікальная, укамплектаваная выкладчыкамі найвышэйшай кваліфікацыі. Рэгулярныя апытанні слухачоў і студэнтаў, якія праводзіць Навукова-даследчы інстытут тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання, гэта пацвярджае.

**Надзея ЮРАШЭВІЧ, загадчыца кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права факультэта кіравання Інстытута кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт:**



— Калі б у Акадэміі кіравання не было ўсіх яе трох інстытутаў, яна была б класічнай ВНУ, арыентаванай на канкрэтную аўдыторыю. Але гэту навучальную ўстанову вылучае тое, што тут атрымліваюць адукацыю адначасова і будучыя кіраўнікі, і дзеючыя, а з нядаўняга часу акадэмія стала супрацоўнічаць яшчэ і са школамі, і ў яе сценах сталі з'яўляцца школьнікі 10-11 класаў. Гэта вельмі важна, бо ім можа стаць далёка не кожны, і той, хто да гэтага імкнецца, павінен разумець, што кіраўнік — вельмі спецыфічны чалавек, які працуе больш, чым астатнія, працуе самааддана і з людзьмі, што патрабуе вялікіх эмацыйных выдаткаў.

Акадэмія праводзіць работу, каб абітурыенты не проста маглі пабываць у яе сценах, але ацанілі, ці правільна яны ўспрымаюць прафесію, з якой вырашылі звязаць свой шлях. Гэтаму дапамагае і спецыфічная атмасфера, якую стварае магчымасць удзелу ў адным мерапрыемстве — семінары, «круглым стале», канферэнцыі — тых, хто ўжо займае высокія пасады, і тых, хто такія пасады будзе займаць у будучыні. Гэты сімбіёз вельмі важны, бо ён яднае аднадумцаў розных пакаленняў.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук, дацэнт:**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Акадэмія кіравання — элітная навучальная ўстанова, якая займаецца падрыхтоўкай кадраў як для дзяржаўнага, так і для недзяржаўнага сектара эканомікі. Гэта ўстанова, у якой вучацца як прадстаўнікі ўладнай вертыкалі, так і тыя, хто мадэрнізуе беларускую эканоміку ў прыватным сектары; тыя, хто прадае беларускую прадукцыю за межы Рэспублікі Беларусь, а таксама тыя, хто прымае меры, каб захаваць стабільнасць валютна-фінансавай сістэмы Беларусі.

Навучальная ўстанова ахоплівае вельмі шырокі спектр. Важнае значэнне акадэміі ў тым, што яна не абмяжоўваецца толькі вектарам, звязаным з дзяржавай. Усе, хто мае патрэбу ў сучасных кіраўнічых тэхналогіях, у сучасных ведах, метадах і спосабах працы рынка, прыходзяць сюды і праз кваліфікаваных выкладчыкаў, праз кампетэнтных дзяржаўных служачых вельмі высокага, найвышэйшага рангу, якіх акадэмія запрашае, атрымліваюць гэту інфармацыю.

## Навука прыняцця рашэнняў

**Андрэй ЦОБКАЛА:** Інстытут дзяржаўнай службы праводзіць падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі слухачоў у рамках дзяржаўнага заказу і за кошт уласных сродкаў. Дзяржаўны заказ фарміруецца штогод па 17 спецыяльнасцях. З верасня мы адкрыем новую — «Дзяржаўнае кіраванне і пракурорскі нагляд». Заказчык — Генеральная пракуратура. У гэтым навучальным годзе мы па дзяржзаказе набралі 430 чалавек, а ў наступным плануем набраць 450. Акрамя таго, яшчэ 500 чалавек — гэта людзі, якія аплачваюць вучобу за кошт уласных сродкаў або сродкаў прадпрыемства. Гэта кіраўнікі кампаній і дзяржаўных органаў улады.

На працягу двух апошніх гадоў дзяржаўны заказ выконвае і Інстытут кіраўніцкіх кадраў па дзвюх спецыяльнасцях: «Дзяржаўнае кіраванне і права» і «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка». Мы зацікаўлены, каб туды накіроўвалі найбольш падрыхтаваных маладых людзей, якія ўваходзяць у кадравы рэзерв. Гэта павінны быць самыя лепшыя, бо сёння ва ўмовах інфармацыйнага ціску малады чалавек мусіць хутка арыентавацца і ўмець на сваім працоўным месцы імгненна прымаць рашэнні.

Выкладчыкі, у сваю чаргу, навучаюць слухачоў і студэнтаў выкарыстоўваць атрыманыя веды пры прыняцці такіх рашэнняў. У наш час ад гэтага залежыць будучыня як маленькага прадпрыемства, так і ўсёй краіны. Навучыць прымаць правільныя рашэнні нам дапамагае і цэнтр сітуацыйнага мадэлявання, дзе кожны слухач можа паспрабаваць сябе на пасадзе кіраўніка прадпрыемства, кіраўніка ўрада або прэзідэнта любой краіны і прапанаваць свой выхад з крызісу.

**Сяргей КІЗІМА:** Што яшчэ вельмі важна для Акадэміі кіравання: паколькі яна шырока ахоплівае прадстаўнікоў самых розных структур, у працэсе практычных заняткаў усе гэтыя людзі перасякаюцца паміж сабой, дзеляцца сваімі ведамі, тэхналогіямі, думкамі, уражаннямі, вопытам работы. Гэта мае не меншую карысць, чым якасная лекцыя.

І ў плане кар'еры Акадэміі кіравання ёсць чым пахваліцца. Паколькі я прадстаўляю кафедру міжнародных адносін, адзначу, што з больш як 5 тысяч выпускнікоў, якія прайшлі праграму нашай кафедры, шэсць з'яўляюцца цяпер намеснікамі міністраў або старшынь дзяржаўных камітэтаў і тры — міністрамі або старшынямі камітэтаў. Чацвёра — дзейныя паслы Рэспублікі Беларусь. Гэта сведчыць пра вельмі незвычайны статус Акадэміі кіравання, бо размова толькі пра адну з 17 яе кафедраў. Гэта яе ўклад у наяўнасць сучасных кіраўнікоў ва ўсіх сферах жыцця беларускай дзяржавы і грамадства.

**Андрэй ЦОБКАЛА:** Статус Акадэміі кіравання ўвесь час расце. Сярод тых асоб, якія Указам Прэзідэнта зацвярджаюцца на вышэйшых дзяржаўных пасадах, 70% — выпускнікі нашай навучальнай установы. Цяпер працуюць два віцэ-прэм'еры і 20 міністраў і старшынь дзяржкамітэтаў — выпускнікоў Акадэміі кіравання.

Ва ўмовах неабходнасці аптымізацыі дзяржапарату наша задача — навучыць такому кіраванню, каб скарачэнне колькасці дзяржаўных служачых не паўплывала на якасць іх работы.

Згодны з думкай, што ў акадэміі важна не толькі веды, якія тут можна атрымаць, але і зносіны, якія тут можна мець. Сюды з'язджаюцца людзі з розных мясцін Беларусі, рознага менталітэту, і кантакты іх паміж сабой вельмі дапамагаюць лепшаму ўзаемаразуменню, усталяванню новых сувязяў, у тым ліку прафесійных.




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## Унікальнасць атмасферы

**Надзея ЮРАШЭВІЧ:** У іншых ВНУ таксама ёсць інавацыйныя тэхналогіі, новыя падыходы ў адукацыі, таксама ёсць «круглыя сталы», канферэнцыі і семінары. Але ў Акадэміі кіравання рэалізуецца парадыгма адукацыі праз усё жыццё, бо, апроч пералічаных этапаў адбору і навучання, у нас ёсць яшчэ і факультэт павышэння кваліфікацыі, дзе нашы выпускнікі перыядычна і ў абавязковым парадку праслухоўваюць цыклы лекцый, прысвечаных тым або іншым праблемам. Гэта тычыцца і выкладчыкаў акадэміі.

**«У міжнародным супрацоўніцтве Акадэмія кіравання імкнецца выкарыстоўваць любы паспяховы вопыт. У прыватнасці, нас вельмі цікавіць вопыт Паўднёвай Карэі па стварэнні электроннага ўраду. Гэтым не толькі наша акадэмія цікавіцца, але і беларускі ўрад».**

Вось чаму без усякага перабольшвання можна казаць, што Акадэмія кіравання — адзіная з сваім родзе ВНУ у краіне, і гэтым тлумачыцца актыўная ўвага да яе з боку замежных партнёраў. Апошнім часам установу часцей наведваюць дыпламатычныя службы, у яе сценах заключаюцца міжнародныя дагаворы, адбываюцца студэнцкія абмены. Калі раней замежныя сувязі былі звязаны з персаналіямі, з канкрэтнымі вучонымі, то цяпер сама навучальная ўстанова стала брэндам сусветнага ўзроўню. Даўно ўжо маецца запыт на тое, каб Акадэмія кіравання пашырыла падрыхтоўку замежнікаў. У нас ужо ёсць замежныя студэнты і аспіранты.

Асаблівая атмасфера акадэміі абумоўлена яшчэ і агульнай мэтай, якая аб'ядноўвае ўсіх яе студэнтаў, слухачоў і выкладчыкаў. Гэтая мэта зводзіцца да таго, каб кожны па сіле сваіх магчымасцяў унёс уклад у развіццё сваёй дзяржавы. Патрыятычны складнік — неад'емная частка Акадэміі кіравання. Гэты складнік дасягаецца не проста словамі лектара пра тое, што сваю краіну трэба любіць, а тым, напрыклад, што кожны, хто тут навучаецца, па-за вучэбнай дзейнасцю знаёміць астатніх з мясцовасцю, у якой ён працуе або нарадзіўся, з дасягненнямі гэтай мясцовасці. Расказвае пра тое, што ён сам бы зрабіў для сваёй малой радзімы. Такія рэчы не толькі аб'ядноўваюць студэнцкае асяроддзе, але і фарміруюць стратэгічнае мысленне. Падобных праектаў мноства. Тут кожны можа праверыць сябе на гатоўнасць да публічнасці і да адказнасці.

У выхаваўчай дзейнасці мы пайшлі па шляху ўцягнення студэнтаў у навуковыя працэсы і мерапрыемствы, звязаныя з гісторыяй Беларусі. Чаго вартае наведванне нашымі студэнтамі буйной міжнароднай канферэнцыі па Вялікім Княстве Літоўскім! Студэнты атрымалі сапраўднае натхненне, бо яны на свае вочы ўбачылі аўтараў вядомых манаграфій і падручнікаў і сталі на многія рэчы глядзець глыбей, а многія факты, распаўсюджаныя ў інтэрнэце, часцей правяраць на дакладнасць.

І, безумоўна, асаблівая атмасфера акадэміі была б немагчымая без спецыфічнага прафесарска-выкладчыцкага калектыву, дзе кожны выкладчык з'яўляецца ўзорам для студэнта, пачынаючы ад асабістых якасцяў, дысцыпліны і заканчваючы ўзроўнем кампетэнцыі.

**Андрэй ЦОБКАЛА:** Тры гады таму ў Інстытуце дзяржаўнай службы з'явілася унікальная спецыяльнасць — «Дзяржаўнае будаўніцтва», на ёй сёння вучацца 74 чалавекі. Гэта ўжо не перападрыхтоўка, а другая або наступная вышэйшая адукацыя. На яе паступаюць толькі кіраўнікі прадпрыемстваў або дзяржаўных органаў улады і іх намеснікі, якія маюць стаж работы кіраўніком і ўзрост да 45 гадоў. Тут выкарыстоўваюцца найноўшыя тэхналогіі ў выкладанні. У вучэбных планах гэтай спецыяльнасці вельмі шмат дысцыплін на выбар, і апошнім часам назіраецца тэндэнцыя выбару часцей грамадскіх дысцыплін: гісторыі, ідэалогіі, дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, палітычныя і прававыя вучэнні ў свеце. І гэта радуе.

## Адкрытасць і збіранне лепшага

**Сяргей КІЗІМА:** У міжнародным супрацоўніцтве мы імкнёмся выкарыстоўваць любы паспяховы вопыт. У прыватнасці, нас вельмі цікавіць вопыт Паўднёвай Карэі па стварэнні электроннага ўраду. Гэтым не толькі наша акадэмія цікавіцца, але і беларускі ўрад. У нас па гэтай тэме паўднёвакарэйскі прафесар правёў навучальны курс. Нам цікавы вопыт Кітая, ВУП якога апошнія 35 гадоў рос амаль па 10% за год і які стаў самай буйной эканомікай у свеце, дзе вельмі эфектыўна развіваецца сектар высокіх тэхналогій. У Еўрапейскім саюзе нам цікавы вопыт высокатэхналагічнай і экспартаарыентаванай эканомікі Германіі, Галандыі і шэрагу іншых краін, дзе дэманструюць сур'ёзныя здольнасці нарошчваць экспарт, павышаць у ім долю высокатэхналагічных тавараў і адначасова нарошчваць экспарт паслуг. Апошняе вельмі важна для Беларусі, для балансу адмоўнага сальда ў сферы гандлю таварамі і, адпаведна, для захавання валютна-фінансавай сістэмы ў стабільным стане.

У нас няма ідэалагічных прыярытэтаў, забароненых напрамкаў, мы выкарыстоўваем усё найлепшае, незалежна ад краіны, дзе гэта прыдумана і апрабавана. Калі такое можна прымяніць у Беларусі, мы павінны расказаць пра гэта тым, хто прыходзіць да нас вучыцца.

Дваццаць працэнтаў выкладчыкаў толькі маёй кафедры прайшлі трохтыднёвыя стажыроўкі па розных напрамках у Кітаі па лініі міністэрства камерцыі КНР, выкладчыкі кафедры таксама праходзілі стажыроўкі ў Германіі, Японіі і шэрагу іншых дзяржаў.

Цікавы свету і наш вопыт. Напрыклад, выкладчыкі кафедры міжнародных адносін выступалі з дакладамі на канферэнцыях у Лондане, Парыжы, Нью-Ёрку, Будапешце, Барселоне, Вільнюсе, Варшаве і многіх іншых гарадах. Мы ўсё больш актыўна супрацоўнічаем з арганізацыямі, якія ўваходзяць у структуру ААН. Беларуская вышэйшая адукацыя ў цэлым мае высокую ацэнку ў свеце.

**Надзея ЮРАШЭВІЧ:** Сёлета, дарэчы, плануецца XII міжнародную канферэнцыю «Дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі і павышэнне эфектыўнасці суб'ектаў гаспадарання», адным з арганізатараў якой з'яўляецца Акадэмія кіравання, правесці на тэрыторыі іншай дзяржавы.

**Андрэй ЦОБКАЛА:** У апошні час жыццё ў акадэміі стала больш насычаным, больш адкрытым. У снежні мы ўрачыста віталі назву грамадскага прыпынку «Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь», тады ж распрацавалі мабільны дадатак нашага афіцыйнага сайта.

**Надзея ЮРАШЭВІЧ:** Чаканні з боку грамадства адносна Акадэміі кіравання вышэйшыя ў параўнанні з іншымі ВНУ. Бо статус прэзідэнцкай, які акадэмія набыла ў 1995 годзе, абавязвае адпавядаць самай высокай планцы ва ўсіх адносінах.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
medvedeva@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Юрый КАЗІЯТКА:

# «ЁСЦЬ ЧАЛАВЕК — БУДУЦЬ НАВІНА, СЮЖЭТ І ШОУ»



**У тэлеканала «Сталічнае тэлебачанне» ёсць добрая традыцыя — у першы дзень новага года сустракаць дзень нараджэння. За 15 гадоў яго карэспандэнты праехалі 5 мільёнаў кіламетраў у пошуках інфармацыі, пабывалі на ўсіх кантынентах, знялі 135 тысяч сюжэтаў, сотні праграм і дзясяткі фільмаў. Пачыналася ўсё з вяшчання адной праграмы навін па Мінску, а сёння творчы калектыў у некалькі соцень чалавек робіць выпускі навін, вядомыя шоу, аналітычныя, музычныя праекты, даступныя для прагляду гледачам Беларусі і ўсяму свету ў інтэрнэце. Скарыстаўшыся нагодай, мы завіталі ў госці да генеральнага дырэктара СТБ Юрыя КАЗІЯТКІ, каб даведацца, ці падрыхтаваны ў іх «залаты» запас кадраў, чым жыве цяпер тэлеканал, што дазваляе яму заставацца цікавым і канкурэнтаздольным.**

***— Сёлета тэлеканалу «Сталічнае тэлебачанне» споўнілася 15 гадоў. Для вас гэта...***

— 1 студзеня 2001 года мы з'явіліся на беларускай тэлевізійнай прасторы. І вось святкуем юбілей, за чым можна назіраць увесь месяц у эфіры. Да ўзроўню вяшчання на рэспубліку мы дараслі даўно, і хачу сказаць, што ў гэтым не толькі дасягненне каманды, якая пад маім кіраўніцтвам вось ужо дзесяцігоддзе робіць СТБ, але і заслуга маіх папярэднікаў — Рыгора Новікава, які ствараў «Сталічнае тэлебачанне» як гарадскі канал, Аляксандра Зімоўскага, які пачаў будаваць «вялікі карабель», а мы ў сваю чаргу надзьмулі ветразі і адправілі яго ў вялікае плаванне — за дзесяць гадоў мадыфікавалі і перайначылі, стварыўшы сапраўдную мадэль агульнанацыянальнага тэлебачання. Цяпер мы існуём у складзе холдынга, куды ўваходзяць СТБ і РТР-Беларусь. І дзякуючы лічбаваму вяшчанню сёння нас можа глядзець уся краіна.

***— Ваш калектыў — гэта каманда з пастаяннымі «гульцамі»?***

— Калі мы гаворым пра адметныя праграмы, праекты любога тэлеканала, то варта памятаць, што яны зроблены людзьмі. І я ганаруся, што за апошнія дзесяць гадоў у нас створана ядро прафесійных тэлевізійных менеджараў. Гэта і Павел Каранеўскі, які курыруе праграму «Раніца. Студыя добрага настрою» і зрабіў уклад у стварэнне Нацыянальнай музычнай прэміі на падмурку музычнай прэміі СТБ. Узгадаць варта і імя маладога кіраўніка Настассі Ганіевай, якая прадзюсіруе народнае шоу «Гарады, якія спяваюць». Ірына Рамбальская — наш генератар ідэй. Напярэдадні 15-годдзя яна прыдумала і зрабіла каляндар, дзе нашых вядучых мы можам убачыць у вобразах акцёраў (праект падмацаваны серыяй відэаролікаў у эфіры СТБ). Нельга не адзначыць імёны такіх прафесіяналаў, як Людміла Кавалёва (яна 10 гадоў кіравала інфармацыйным вяшчаннем), Сяргей Новікаў (адзін з «зуброў» сярод тэлеаператараў, які мае адметную школу і вопыт стварэння шматлікіх праектаў). І гэты спіс можна працягваць... Калі казаць пра моладзь і яе жаданне ў нас працаваць, то мы заўсёды рады і студэнтам, і маладым журналістам. Да нас прыходзяць людзі розных прафесій, і, назіраючы ў іх жаданне паспрабаваць свае сілы ў тэлевізійнай журналістыцы, мы ўсім даем шанц. Напрыклад, Ігар Пазняк — яркі тэлевядучы і выдатны журналіст — па адукацыі настаўнік геаграфіі. Ёсць у нас шэраг праектаў, якія мы выпускаем у тэлестудыі Інстытута журналістыкі. Ведаеце, у жыцці складваюцца розныя сітуацыі: нехта сыходзіць, у кагосьці нараджаецца дзіця, але ў нас заўсёды ёсць «залаты запас» — «маладыя ваўкі», якія імкнуцца праявіць сябе на справе. Яны перспектыўныя і хоць заўтра могуць запоўніць любы кадравы «прабел».

***— Вы ў свой час працавалі ваенным журналістам. Ці дапамагае той вопыт вам як кіраўніку?***

— Тэлебачанне — вельмі тэхналагічны працэс. І дысцыпліна, з якой у некаторых асацыюецца слова «ваенны», у нашай працы мае не менш важнае значэнне, чым творчасць. Я патрабую ад людзей дакладнасці і пунктуальнасці ў працоўным працэсе. Часам, магчыма, прымушаю вельмі скрупулёзна ставіцца да стварэння сюжэтаў, праграм. Разам з тым ніколі не ўмешваюся ў працэс, калі бачу, што ўсё зробяць правільна. Пры наяўнасці творчасці і крэатыўнага падыходу я давяраю супрацоўнікам. Але, назіраючы адсутнасць ініцыятывы і разумеючы, што чалавека трэба штурхаць, падключаюся да працы.

***— Калі параўнаць тэлежурналістыку ўчора і сёння — у чым розніца?***

— У цэнтры журналістыкі, у тым ліку і тэлевізійнай, заўсёды былі і застаюцца галоўнымі цікавая інфармацыя і людзі. Калі мы, напрыклад, гаворым пра шоу, то нам хочацца бачыць вясёлых, разумных герояў і вядучага, які здольны развіваць сітуацыю. Адрозненне журналістыкі сучаснай бадай толькі ў тым, што з'яўляюцца новыя тэхналогіі, а сутнасць застаецца ранейшай. Усё проста, калі ёсць чалавек — будуць навіна, сюжэт і шоу.

***— А ці з'яўляецца сёння прафесія журналіста прэстыжнай?***

— У нашай краіне, я заўважыў, апошнім часам да прафесіі журналіста людзі ставяцца больш сур'ёзна. Хаця, згадайце, быў перыяд на пачатку 90-х, калі ўсё разбуралася на вачах, узнікла палітычнае супрацьстаянне ў грамадстве... І, безумоўна, у тых умовах прафесія журналіста, перш за ўсё журналіста дзяржаўных СМІ, падвяргалася кампраметацыі. Сёння таксама ёсць СМІ рознай накіраванасці і дзве журналісцкія арганізацыі — як клубы па палітычных інтарэсах, на жаль... Але ўжо адсутнічае былое процістаянне, і грамадства разумее, што журналіст — патрэбная прафесія. Тым больш у Беларусі ёсць выбар на рынку інфармацыі — чытайце тых, каму больш давяраеце. А для нас галоўнае — здабываць і даносіць дакладную інфармацыю.

> **«У тэлебачання ёсць розныя місіі, і адна з іх — расказваць людзям не толькі пра станоўчыя, але і адмоўныя падзеі ў нашым жыцці».**

***— Як «Сталічнаму тэлебачанню» ўдаецца пры цяперашняй разнастайнасці тэлеканалаў не страціць гледача?***

— Кожны тэлеканал, як і чалавек, мае свой твар, свой характар. Мы, напрыклад, не авантурысты, але вельмі азартныя. У многіх нашых праграмах прысутнічае элемент канкурэнцыі. У праграме «Гарады, якія спяваюць» — гэта конкурс галасоў і артыстычнасці, інтэлектуальнае шоу «Разумней не прыдумаеш» з Міхаілам Марфіным дапамагае вызначыць самых разумных. А калі кажам пра навіны, то там заахвочваем людзей, якія не проста зрабілі добры рэпартаж, а яшчэ і хутчэй за іншых здабылі інфармацыю...

На жаль, сёння ў нас на тэлевізійным рынку адсутнічае якаснае тэлевымярэнне, таму мы не заўсёды ведаем запыты аўдыторыі дакладна. І часам даводзіцца працаваць інтуітыўна. Але мы прапаноўваем сваім гледачам выбар: інфармацыю, шоу, музычныя праекты і якасны кінапаказ. Імкнёмся захоўваць густ да сапраўдных каштоўнасцяў у аўдыторыі.

***— Канкурэнцыя сярод беларускіх тэлеканалаў адчувальная?***

